Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
16 ЧЭРВЕНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №113 (28477)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




**Без чаго не плывуць караблі**

СТАР. 13



**Сакрэты старой хаты**

СТАР. 16



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Алена БОГДАН, начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя:**

*«Тэхналогія электроннага рэцэпта, якая ўкараняецца цяпер у Беларусі, ляжа ў аснову для стварэння адзінай інфармацыйнай сістэмы аховы здароўя. Для кожнага чалавека будзе персанальна распрацавана медыцынская электронная карта, у кожнага пацыента будзе свой электронны медыцынскі кабінет. Ужо сёння многія паліклінікі, мінскія і не толькі, вядуць электронныя медыцынскія карты. Гэта дазваляе кансультаваць пацыентаў у аддаленым рэжыме, наладжваць з імі больш эфектыўны дыялог».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.06.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8840 | ▲ |
| Еўра | 2,1071 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0328 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0724 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Усё па навуцы



Малодшыя навуковыя супрацоўнікі Цэнтральнага батанічнага саду Яўгенія ЛЕГАРАВА і Яна АПАСАВА за мікрачаранкаваннем высокарослых буякоў у новазбудаванай лабараторыі мікраканальнага размнажэння раслін. Праца батанікаў ручная і праходзіць у стэрыльных умовах.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Людзі і лёсы

## І МЕЖ НЯМА ДЛЯ ДУШЫ

### Анатоль Галушка стварае свае карціны з дапамогай пэндзля, які заціскае ў зубах



**У Брэсце працягваецца персанальная выстаўка мастака з вёскі Магіліцы Івацэвіцкага раёна Анатоля ГАЛУШКІ пад назвай «Пішу зямлі тваёй красу». Экспазіцыю склалі 60 работ аўтара, у асноўным пейзажы па матывах родных мясцін, ёсць і нацюрморты з кветкамі. Гэтая выстаўка адразу заварожвае сонечным святлом, мноствам жоўтых і аранжавых фарбаў, адчуваннем бясконцасці і ўрачыстасці. Спакойнае хараство льецца ў душу ад карцін чалавека, які амаль нерухомы. Нават уявіць сабе цяжка, што работы напісаны не рукамі.**

На адкрыцці Анатоль прызнаўся, што гэтую выстаўку рыхтаваў цэлы год. Вернісаж далёка не першы ў біяграфіі мастака. Яго жывапісныя карціны бачылі жыхары Бярозы, Белаазёрска, Пружан, Мінска. Самая першая выстаўка адбылася ў Мінску. І не проста ў сталіцы — у фае Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Пасля гэтага было шмат увагі, падарункаў, слоў падтрымкі, што, несумненна, дадало натхнення ў далейшай творчасці.

Член сусветнай арганізацыі мастакоў-інвалідаў стварае карціны з дапамогай пэндзля, які заціскае ў зубах. Лёс вельмі жорстка абышоўся з гэтым чалавекам. У сямнаццаць гадоў, толькі стаўшы курсантам мараходнага вучылішча, ён атрымаў траўму і назаўсёды аказаўся прыкаваным да ложка. Праз шэсць гадоў памёр бацька — не змог перанесці пакут сына. Анёлам-ахоўнікам Анатоля, яго рукамі і нагамі стала мама Лідзія Іванаўна.

СТАР. 3

■ Ідэя +

## «ЗНАЙСЦІ ВЫЙСЦЕ МОЖНА З ЛЮБОЙ СІТУАЦЫІ»

### Рэгіянальны кіраўнік Бізнес-школы ІПМ у Магілёве Ганна Перунова пра тое, чаго не хапае прадпрымальным людзям для поспеху



**Бізнес-школа ІПМ — гэта, па сутнасці, цэнтр павышэння кваліфікацыі для бізнесменаў, які існуе ў Беларусі ўжо 20 гадоў. А два гады таму яго філіялы пачалі з'яўляцца і ў абласных цэнтрах. Не трэба быць прадпрымальнікам, каб разумець: існаваць у свеце рынычных адносін стыхійна нельга. Сёння, калі ўсё так імкліва мяняецца, удасканальваецца, ускладняецца, нават дыплом з адзнакай прэстыжнага эканамічнага ўніверсітэта не гарантуе, што ведаў хопіць на ўсё астатняе жыццё. Пра тое, наколькі прадпрымальным людзям цікавыя механізмы паспяховага вядзення бізнесу, хто іх у сябе ўкараняе і як развіць у сабе талент прадпрымальніка, гутарым з рэгіянальным кіраўніком магілёўскай Бізнес-школы ІПМ Ганнай ПЕРУНОВАЙ.**

***— Ганна, і ўсё ж такі навошта спатрэбілася адкрываць філіялы ў абласных цэнтрах? Няўжо наш айчынны бізнес так актывізаваўся, што цэнтральны офіс у Мінску не спраўляецца ўсіх адукоўваць?***

— Мы проста паклапаціліся пра тое, каб якасная адукацыя была больш даступнай у рэгіёнах. Гэта дазваляе вучыцца без адрыву ад працоўнага працэсу і эканоміць час і грошы на камандзіроўках. Я не скажу, што ў нас вельмі шмат вучняў.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# З АПОРАЙ НА ЎЛАСНЫЯ СІЛЫ

## Кіраўнік дзяржавы агучыў сваё бачанне развіцця АДКБ

**Сімвалічна, што ўчарашняе мерапрыемства ў Палацы Незалежнасці — сустрэча Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з сакратарамі саветаў бяспекі дзяржаў — удзельніц АДКБ — праходзіла ў гістарычнай зале. Менавіта ў ёй у свой час адбываліся перагаворы лідараў «нармандскай чацвёркі», дзе былі выпрацаваны Мінскія пагадненні...**

**Час для стратэгічных рашэнняў**

У год свайго старшынства ў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы Беларусь імкнецца зрабіць сітуацыю ў рэгіёне як мага больш стабільнай.

— Пасяджэнне нашага Камітэта сакратароў праходзіць у няпросты час, — адзначыў беларускі лідар на пачатку сустрэчы. — Міжнародная сітуацыя характарызуецца ростам нестабільнасці, перабудовай адносін паміж сусветнымі цэнтрамі сілы, узмацненнем жорсткасці ўзаемнай канкурэнцыі, актыўна фарміруюцца ўмовы для пераносу супрацьстаяння ў касмічную сферу, кіберпрастору.

На межах краін — удзельніц АДКБ нарошчваецца ваенная інфраструктура НАТА, разварочваецца сістэма супрацьракетнай абароны, рэалізуюцца праекты па стварэнні высакадакладнай зброі. Канфлікты, эканамічныя і сацыяльныя ўзрушэнні працягваюць заставацца крыніцамі міграцыйнага крызісу.

— Асаблівую пагрозу ўяўляе тэрарыстычная актыўнасць у Еўропе і Цэнтральнай Азіі, турбуе супрацьстаянне на паўднёвым усходзе Украіны, Нагорным Карабаху, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Нягледзячы на станоўчыя тэндэнцыі, якія намеціліся, неўрэгулявана сітуацыя вакол Прыднястроўя. Відавочна, што ў гэтых умовах павышаецца значнасць нашай Арганізацыі.

Так, у сілу функцыянальнасці АДКБ у яе ёсць патэнцыял для таго, каб іграць важную ролю ў будучай абноўленай архітэктуры бяспекі Еўразійскага кантынента. На думку кіраўніка дзяржавы, неабходна своечасова прымаць стратэгічныя рашэнні, заснаваныя на адзінстве і саюзніцкай згуртаванасці, выбудоўваць узгодненыя калектыўныя адказы на глабальныя і рэгіянальныя выклікі.

**Свае праблемы вырашаем самастойна**

Гаворачы пра сітуацыю ў рэгіёне АДКБ, кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць: мы можам і павінны вырашыць існуючыя ў нас праблемы:

— Шчыра хачу вам сказаць, што калі б мы вырашылі тыя насцярожваючыя моманты і кропкі нестабільнасці на нашай прасторы — я іх пералічыў у пачатку, — думаю, аўтарытэт нашай Арганізацыі значна б вырас.

Прэзідэнт падкрэсліў: было б добра, каб калі-небудзь гэтыя пытанні ў парадак дня былі ўсё-такі ўнесены.

Прэзідэнт выказаўся і наконт Мінскіх пагадненняў.

— Як я бачу, Мінскія пагадненні пачалі ўжо падвяргацца атакам з боку тых дзяржаў, якія павінны былі б сесці за стол перагавораў і далучыцца да гэтага фармату. Ужо ідуць намёкі пра тое, што можна і без мінскага фармату быць, можна знайсці нейкія іншыя спосабы ўрэгулявання ўкраінскага канфлікту. Можна, безумоўна, але пачынаць з пачатку заўсёды больш складана, чым працягваць добрую справу. Таму хацелася б пачуць ваш пункт гледжання, — звярнуўся беларускі лідар да прысутных.

**Шэсць галоўных задач**

Як кіраўнік краіны, якая цяпер старшынствуе ў АДКБ, Аляксандр Лукашэнка пералічыў найважнейшыя задачы для развіцця Арганізацыі на сучасным этапе.

Па-першае, гэта каардынацыя знешнепалітычнай дзейнасці дзяржаў-членаў. Па-другое, супрацоўніцтва Арганізацыі з вядучымі універсальнымі, рэгіянальнымі міжнароднымі структурамі. Па-трэцяе, комплекснае ўмацаванне ваеннага, ваенна-тэхнічнага, антыкрызіснага і міратворчага патэнцыялу АДКБ. Па-чацвёртае, супрацьдзеянне міжнароднаму тэрарызму, барацьба з незаконным абаротам наркотыкаў. Па-пятае, забеспячэнне стабільнай міграцыйнай абстаноўкі. Шостая задача — удасканаленне юрыдычнай асновы механізмаў узаемадзеяння ў рамках Арганізацыі.

Як і падчас сустрэчы з міністрамі абароны краін — удзельніц АДКБ, Прэзідэнт падкрэсліў: Беларусь застаецца вернай сваім абавязкам перад Арганізацыяй.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** yushkevich@zviazda.by

# «АЛЬФА-ГРУП» ПАШЫРАЕ ПРЫСУТНАСЦЬ

**Учора кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу з Пятром Авенам, старшынёй савета дырэктараў ABH Holdings S.A, членам савета дырэктараў «Альфа-Банка» (Расія), членам назіральнага савета «Альфа-Груп».**

— Улічваючы блізкія адносіны Беларусі і Расіі, дзіўна, што дагэтуль такая магутная арганізацыя, як ваша, маючы такія магчымасці і фінансавыя, і матэрыяльныя, не вельмі прадстаўлена ў Беларусі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Хацелася б, каб гэта атрымала далейшае развіццё і каб ваша група кампаній убачыла Беларусь і знайшла тут сваё месца. Я гатовы падключыцца да таго, каб ваша група магла працаваць у інтарэсах і Беларусі, і Расіі з выкананнем усіх законаў і прынцыпаў вядзення бізнесу, якім вы адданы, я гэта добра ведаю.

Пётр Авен расказаў, што кампанія развівае свой бізнес, перш за ўсё гэта датычыцца «Альфа-Банка». Асабліва кансорцыуму цікавы рознічны рынак і электронныя бізнес.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** yushkevich@zviazda.by

## ■ Парламенцкі дзённік

# Праца, адукацыя, бізнес

### Саюзная дзяржава вызначае прыярытэтныя напрамкі развіцця

**Парламентарыі дзвюх краін падчас пасяджэння 52-й сесіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі ў Мінску абмеркавалі магчымасці збліжэння нацыянальных заканадаўстваў, выкананне задач Саюзнай дзяржавы ў апошнія чатыры гады, а таксама фарміраванне напрамкаў яе развіцця да 2022 года. Асобная ўвага была ўдзелена эфектыўнасці рэалізацыі праграм Саюзнай дзяржавы.**

Па словах **старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзіміра АНДРЭЙЧАНКІ,** нягледзячы на тое, што ў рамках Саюзнай дзяржавы ў апошні час зроблены вельмі сур'ёзныя напрацоўкі, патэнцыял арганізацыі выкарыстаны не цалкам. «І ў першую чаргу гэта датычыцца забеспячэння роўнасці правоў грамадзян Расіі і Беларусі ў многіх сферах і пытанняў гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Таму пазіцыя саюзных парламентарыяў адназначная: нам трэба больш рашуча працаваць у перааддаленні ўсіх перашкод», — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка.

**Старшыня Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі Вячаслаў ВАЛОДЗІН** паведаміў журналістам, што сесія дазволіла вызначыць перспектыўныя напрамкі далейшага дыялогу. «Наступнае пасяджэнне, якое пройдзе сёлета ў снежні ў Бранску, будзе складацца з парламенцкіх слуханняў такіх пытанняў, як абарона правоў грамадзян і гарманізацыя заканадаўства ў гэтай сферы. Гэта таксама і тэмы, якія звязаны з абаронай працы і аховай здароўя, адукацыяй. На снежаньскім пасяджэнні будзе таксама прымацца бюджэт. У рамках гэтай сесіі мы не толькі падводзілі вынікі, але і распрабавалі змадэляваць тое, што можна зрабіць у наступныя пяць гадоў», — дадаў Вячаслаў Валодзін.

**Член Камісіі Парламенцкага сходу па эканамічнай палітыцы Алена ПАНІНА** лічыць, што абедзве дзяржавы палепшылі супрацоўніцтва ў частцы рэалізацыі сумесных праграм. «Аднак механізм укаранення інавацыйных распрацовак у нас недастаткова адпрацаваны ў рамках Саюзнай дзяржавы», — падкрэсліла яна.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** kryzhevich@zviazda.by ■

## СПАЧУВАННІ ПРЭЗІДЭНТА



Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні ў сувязі са смерцю народнага артыста СССР Аляксея Баталава. «З яго легендарным імем звязаны яркія і незабыўныя старонкі гісторыі савецкага і расійскага кінематографа. Фільмы з удзелам Аляксея Баталава па праве ўваходзяць у залаты фонд сучаснай культуры», — гаворыцца ў спачуванні.

Як паведамлялася, народны артыст СССР Аляксей Баталаў памёр у ноч на 15 чэрвеня ва ўзросце 88 гадоў. Акцёр пайшоў з жыцця ў адной з маскоўскіх бальніц. У апошнія пяць месяцаў ён знаходзіўся ў шпіталі.

Аляксей Баталаў здымаўся ў фільмах «Масква слязам не верыць», «Справа Румянцава», «Ляцяць журавлі», «Дарагі мой чалавек». Паставіў фільмы «Шынель», «Тры таўстуны» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі РСФСР імя братоў Васільевых, Дзяржаўных прэмій СССР і РФ.

## ■ Бяспека

# АХОВА АНЛАЙН

### Летась было выяўлена больш за 11 000 небяспечных інфармацыйных рэсурсаў

**Гэта стала магчыма дзякуючы спецыяльнай аперацыі «ПРОКСІ», якая накіравана на процідзеянне крыміналу ў інтэрнэце. На пасяджэнні Камітэта сакратароў АДКБ, якое прайшло ўчора ў Мінску, абмеркавалі павышэнне эфектыўнасці гэтай праграмы і гарантаванне інфармацыйнай бяспекі дзяржаў.**

**Генеральны сакратар Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы Юрый ХАЧАТУРАЎ** адзначыў, што пастаянна расце дэструктыўнае інфармацыйнае ўздзеянне на краіны, інтэрнэт у сваіх мэтах выкарыстоўваюць і тэрарысты. З улікам гэтага ў АДКБ плануюць падрыхтаваць шэраг канкрэтных прапаноў і накіраваць іх на разгляд кіраўнікам дзяржаў-удзельніц.

«Мы таксама сёння разгледзелі пытанні, якія датычацца ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва, і я думаю, што восенню на сесіі Савета калектыўнай бяспекі мы прадставім кіраўнікам нашых дзяржаў некаторыя змены ў прынцыпы ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва АДКБ», — паведаміў **Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Беларусі Станіслаў ЗАСЬ.**

**Надзея АНІСОВІЧ.** anisovich@zviazda.by ■

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Нямецкі парламентарый: адносіны з Расіяй можна палепшыць за кароткі час

Партыйны блок Хрысціянска-дэмакратычнага і Хрысціянска-сацыяльнага саюзаў (ХДС/ХСС), які ўзначальвае канцлер Германіі Ангела Меркель, прыхільнік нармалізацыі адносін з Расіяй. Пра гэта заявіў Юрген Харт, каардынатар урада ФРГ па трансатлантычным супрацоўніцтве.

«Цяпер вядзецца работа над перадвыбарчай праграмай. Для ХДС і для ХСС застаецца важнай мэтай паляпшаць палітычныя, эканамічныя і міжграмадскія адносіны з Расіяй. Мы выступаем за партнёрскае супрацоўніцтва з РФ», — сказаў палітык.

Аднак у будучыні, як лічыць Харт, такое супрацоўніцтва «будзе магчымым толькі пры гатоўнасці і жаданні Расіі актыўна аднаўляць страчаны давер». «Да гэтага адносіцца прыхільнасць вяршэнству міжнароднага права і недатыкальнасць межаў суверэнных дзяржаў», — дадаў ён.

### Сенат ЗША ўхваліў пашырэнне санкцый супраць Расіі

Амерыканскія сенатары напярэдадні большасцю галасоў адобрылі законапраект, які пашырае санкцыі супраць Расіі. Як паведамляюць інфармагенцтвы, Сенат прагаласаваў за новыя санкцыі ў адказ на меркаванае ўмяшанне Расіі ў прэзідэнцкія выбары ў ЗША ў 2016 годзе.

Прапанаваныя санкцыі маюць на ўвазе скарачэнне максімальнага тэрміну рынкавага фінансавання расійскіх банкаў да 14 дзён, а кампаній нафтагазавага сектара — да 30 дзён. Акрамя таго, на працягу 180 дзён пасля ўвядзення паправак кіраўнік Мінфіна ЗША павінен прадставіць у кангрэс даклад аб магчымых наступствах распаўсюджвання санкцый на суверэнны доўг Расіі. Гэтыя абмежавальныя меры былі прадстаўлены ў выглядзе папраўкі да законапраекта аб прымяненні санкцый у дачыненні да Ірана. Акрамя таго, сенатары прагаласавалі за ўвядзенне палажэння, згодна з якім прэзідэнту ЗША Дональду Трампу спатрэбіцца атрымаць адабрэнне Кангрэса, калі ён вырашыць аслабіць любыя дзеючыя санкцыі.

Цяпер законапраект пяройдзе на разгляд у палаты прадстаўнікоў Кангрэса, адкуль, у выпадку зацвярджэння, адправіцца на подпіс кіраўніку Белага дома.

### Вакуумны цягнік будучыні прэзентавалі ў Астане




Звышхуткасны вакуумны цягнік прэзентаваны ў ходзе канферэнцыі на тэму «Энергія і тэхналогіі будучыні» ў Астане.

«Мы распрацоўваем сістэму, каб цалкам змяніць спосаб перамяшчэння людзей і тавараў пры дапамозе стварэння трубы і ліквідацыі ціску ў ёй, якую мы зможам адпраўляць на неймаверна высокіх хуткасцях — каля 1200 км/г. Так мы скароцім час і адлегласць. Паездкі, якія займалі дні, цяпер зоймуць гадзіны, а паездкі, на якія мы трацілі гадзіны, цяпер зоймуць хвіліны», — расказаў дырэктар праекта Hyperloop One Колін Рыс.

Чакаецца, што першы звышхуткасны цягнік з'явіцца ў Дубаі ў 2021 годзе і будзе функцыянаваць паміж эміратамі. Hyperloop One уяўляе сабой трубапровад, усярэдзіне якога з хуткасцю ад 480 да 1220 км/г перамяшчаюцца транспартныя капсулы.

Ідэя стварэння новага віду транспарту належыць заснавальніку Tesla Ілану Маску.

## ■ Супрацоўніцтва

# Таджыкістан: гісторыя адзінства і згоды

**У мінскай штаб-кватэры СНД днямі — а дакладней: 26 чэрвеня — пройдзе навукова-практычная канферэнцыя «Таджыкістан: 20 гадоў згоды і яднання». У пярэдадзень сур'ёзнай размовы па праблемах сацыяльна-эканамічнага развіцця адной з краін Садружнасці, беларуска-таджыкскіх гістарычных адносін «Звязда» звярнулася да Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Таджыкістана ў Рэспубліцы Беларусь Казідаўлата КАІМДОДАВА з просьбай расказаць пра падзею:**

— На канферэнцыю мы запрасілі сяброў Таджыкістана — вучоных, творчую інтэлігенцыю, актыў таварыства «Беларусь — Таджыкістан», — зазначыў Казідаўлат Каімдодавіч. — У Беларусі, асабліва ў Мінску, усталяваўся сапраўдны астравок народнай дыпламатыі, звязанай з Таджыкістанам. На розныя фестывалі, святы, выстаўкі завітваюць мае землякі. У Мінску добра ведаюць таджыкскіх пісьменнікаў. Найперш — Ато Хамдама, Нізома Касіма, Леаніда Чыгрына. Апошні з іх — не толькі мой, але і ваш, беларусаў, зямляк. Бо нарадзіўся ў Віцебскай вобласці. А з маленства жыве ў Душанбэ. Напісаў цыкл гістарычных раманаў пра краіны Усходу, пра Таджыкістан, перакладае кнігі таджыкскіх пісьменнікаў на рускую мову. Спадзяёмся, што ўдзел у канферэнцыі прыме і Саюз пісьменнікаў Беларусі. Мікалай Іванавіч Чаргінец — часты госць у нашым пасольстве, часты ўдзельнік розных нашых мерапрыемстваў. Рады будзем бачыць паэтаў Міколу Мятліцкага, Навума Гальпяровіча, якія перакладалі і працягваюць перакладаць таджыкскіх паэтаў. Найперш — такіх нашых знакамітасцяў, як Фарзона, Саідалі Мамур, Мумін Канаат, Лаік Шэралі... Дарэчы, нядаўна мы правялі вечар, прысвечаны Лаіку Шэралі. Поўная зала Дома дружбы па вуліцы Захарава сведчыла, што гэтае імя, творчасць гэтага славутага таджыкскага паэта вядомыя беларусам. Адным словам, да сустрэчы на канферэнцыі!

**Кастусь ЛАДУЦЬКА** ■

■ Сацыяльны клопат

# Хутка могуць з'явіцца квоты па прыёме на працу інвалідаў

**Таксама, магчыма, у людзей з інваліднасцю з'явяцца персанальныя асістэнты. Наогул, у нашай краіне запланаваны шэраг важных змяненняў, якія датычацца людзей з інваліднасцю. Аб гэтым гаворыцца ў Нацыянальным плане дзеянняў па рэалізацыі палажэнняў Канвенцыі аб правах інвалідаў на 2017—2025 гады, які быў зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 13 чэрвеня 2017 года №451.**

Гэта стратэгічны дакумент, накіраваны на фарміраванне ўмоў па забеспячэнні роўнасці правоў людзей з інваліднасцю і стварэнне ўмоў іх інтэграцыі ва ўсе сферы жыццядзейнасці грамадства, адзначаюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

Для рэалізацыі палажэнняў Канвенцыі Нацыянальным планам прадугледжана карэкціроўка заканадаўства. Так, запланавана ўнясенне змяненняў у законы «Аб сацыяльнай абароне інвалідаў у Рэспубліцы Беларусь», «Аб папярэджанні інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў», «Аб архітэктурнай і горадабудаўнічай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь» і іншыя нарматыўныя прававыя акты. Таксама будуць удасканалены нормы, якія гарантуюць аказанне дапамогі і падтрымкі ў надзвычайных сітуацыях інвалідам з улікам іх індывідуальных патрэб.

Яшчэ большая ўвага будзе ўдзяляцца забеспячэнню даступнасці асяроддзя, паслуг і інфармацыі для людзей з інваліднасцю. Плануецца ўвядзенне адміністрацыйнай адказнасці за адсутнасць умоў для доступу інвалідаў да аб'ектаў сацыяльнай, інжынернай і транспартнай інфраструктур. А на работнікаў арганізацый, якія аказваюць паслугі насельніцтву, будуць ускладзены функцыі па аказанні дапамогі інвалідам у пераадоленні бар'ераў, якія перашкаджаюць ім атрымаць гэтыя паслугі.

Нацыянальным планам таксама прадугледжана ўдасканаленне медыцынскай і сацыяльнай дапамогі людзям з інваліднасцю. Спецыялісты вывучаць магчымасць пераходу на працэнтную сістэму вызначэння інваліднасці ў адпаведнасці з Міжнароднай класіфікацыяй функцыянавання, абмежаванняў жыццядзейнасці і здароўя (МКФ). Зменяцца нарматывы забяспечанасці інвалідаў сацыяльнымі паслугамі, якія спрыяюць іх самастойнаму пражыванню.

**Канвенцыя аб правах інвалідаў была падпісана Беларуссю ў 2015 годзе, ратыфікаваная — у 2016-м.**

Каб людзі з інваліднасцю маглі рэалізаваць сваё права на адукацыю, будуць карэктавацца планы навучання студэнтаў з інваліднасцю з улікам іх індывідуальных магчымасцяў. Таксама будзе вывучана магчымасць устанаўлення квот для арганізацый па прыёме на працу інвалідаў.

Плануюцца і змяненні ў сістэме сацыяльнай падтрымкі інвалідаў. Так, у наступныя тры гады спецыялісты будуць працаваць над змяненнем сістэмы фінансавання рэабілітацыі і сацыяльнай падтрымкі інвалідаў. У прыватнасці, будуць вывучаны пытанні ўвядзення персанальнага бюджэту інваліда, стварэння інстытута персанальнага асістэнта інваліда.

Рэалізацыя і маніторынг выканання Канвенцыі будуць ажыццяўляцца Рэспубліканскім міжведамасным саветам па праблемах інвалідаў. Аналагічныя структуры будуць створаны таксама пры аблвыканкамах і Мінскім гарвыканкаме.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■ Прыёмная кампанія — 2017

# ВЫТВОРЦАЎ ТВАРАГУ ПАДРЫХТУЮЦЬ У СЛУЦКУ

**15 чэрвеня ў краіне распачалася ўступная кампанія ў прафесійна-тэхнічныя ліцэі і прафесійна-тэхнічныя каледжы.**

Сёлета прыём па 251 прафесіі будуць ажыццяўляць 146 устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Акрамя таго, для навучання па рабочых прафесіях прыём будуць весці 49 устаноў адукацыі іншых узроўняў, якія рэалізуюць праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

Усяго плануецца набраць 29,9 тысячы чалавек, што лічбавага друку» — у Мінскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы паліграфіі; «кузаўшчык» — у Мінскім дзяржаўным прафесійным ліцэі №3 машынабудавання; «вытворца тварагу» — у Слуцкім дзяржаўным каледжы.

Умовы прыёму на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў параўнанні з папярэднім годам не змяніліся.

Прыём дакументаў на дзённую форму навучання будзе весціся па 20 жніўня. Калі да канца гэтага тэрміну не ўсе



складзе 93,6 працэнта да прыёму 2016 года (на 2 тысячы чалавек менш), у тым ліку за кошт сродкаў бюджэту — 29,7 тысячы чалавек.

З улікам патрэб рэгіянальных рынкаў працы сёлета вырашана было спыніць прыём па 216 незапатрабаваных прафесіях і адкрыць падрыхтоўку па 145 новых для асобных устаноў прафтэхадукацыі прафесіях. Так, упершыню будзе ажыццяўляцца набор па прафесіі «электрамеханік па сродках аўтаматыкі і прыбораў тэхналагічнага абсталявання» ў Гомельскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы электратэхнікі; «рабочы па комплексным абслугоўванні будынкаў і збудаванняў» — у Мінскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы будаўніцтва і камунальнай гаспадаркі; «аператар

планавыя месцы будуць запоўнены, установа адукацыі па ўзгадненні з заснавальнікам можа падоўжыць тэрмін прыёму дакументаў да поўнага ўкамплектавання груп, але не пазней чым да 15 верасня бягучага года. На завочную форму атрымання адукацыі дакументы будуць прымацца з 1 па 10 кастрычніка.

**З 1 чэрвеня да 18 жніўня ў Міністэрстве адукацыі арганізавана работа тэлефоннай гарачай лініі (017) 222-43-12. Таксама на сайце Міністэрства адукацыі можна знайсці электронны даведнік для тых, хто паступае на ўзровень прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## ЁСЦЬ ПРАБЛЕМА — ВАС ВЫСЛУХАЮЦЬ

**У наступную суботу, 17 чэрвеня, аблвыканкамы і Мінгарвыканкам правядуць прамыя тэлефонныя лініі з грамадзянамі сваіх рэгіёнаў.**

Так, тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 правядуць:
**ЛІС Анатоль Васілевіч,** старшыня Брэсцкага аблвыканкама (80162213121);
**СІВЕЦ Уладзімір Мікалаевіч,** намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама (80212222222);
**ДВОРНІК Уладзімір Андрэевіч,** старшыня Гомельскага аблвыканкама (80232751237);
**ЛІСКОВІЧ Віктар Андрэевіч,** намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама (80152735644);
**ВАРОНІН Рыгор Аляксандравіч,** кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама (80222501869);
**НЕЎМЯРЖЫЦКІ Сяргей Пятровіч,** намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама (80175004160);
**ЮРКЕВІЧ Ігар Віктаравіч,** намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама (80172224444).

# Памяць Дальвы: трагедыя вайны не павінна паўтарыцца ніколі

**У суботу, 17 чэрвеня, у мемарыяльным комплексе «Дальва» Лагойскага раёна Мінскай вобласці пройдзе мітынг-рэквіем і жалобнае богаслужэнне ў памяць пра загінулых жыхароў вёскі Дальва.**

19 чэрвеня 1944 года фашысты знішчылі вёску Дальва, зажыва спалілі 44 яе жыхароў: 29 дзяцей, 13 жанчын, двух мужчын. Гэта была апошняя з 628 беларускіх «вогненных вёсак» Вялікай Айчыннай вайны, якія паўтарылі трагічны лёс Хатыні. Дальва загінула, калі да вызвалення заставаліся лічаныя дні...

Пасля вайны на месцы спаленай вёскі жыццё не адрадзілася. Але Дальва засталася — як вёска-помнік. У 1973 годзе быў адкрыты мемарыял «Дальва». Знішчаная вёска пачала сваё другое жыццё. Тут устаноўлены камень з тэкстам — нібыта спаленыя акупантамі людзі просяць у нашчадкаў прабачэння, што не могуць гасцінна сустрэць у вёсцы:

*Спаліў нас вораг чэрвеньскай парою —*
*Дзядоў, жанчын, падлеткаў і дзяцей.*
*Даруйце, людзі добрыя, за тое,*
*Што вас не сустракаем як гасцей.*

Узводзіўся мемарыял у Дальве фактычна на грамадскіх пачатках. Ініцыятарам і «рухавіком» гэтай справы быў Мікалай Пятровіч Гірыловіч. Ён, падлетак, адзін цудам застаўся жыць. І жыццё сваё ўспрымаў як місію — захаваць памяць пра аднавяскоўцаў. У гэтай святой справе дапамагалі калегі з Белтэлерадыёкампаніі, яны прымалі самы актыўны ўдзел ва ўзвядзенні помніка і яго далейшым добраўпарадкаванні.

Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь на працягу вось ужо амаль пяці дзесяцігоддзяў шэфствуе над мемарыялам у Дальве.

**Дырэктар ДМК «Хатынь» Артур ЗЕЛЬСКІ** адзначыў:

— Дальву называюць сястрой Хатыні — і цяпер мемарыяльны комплекс «Дальва» з'яўляецца філіялам Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Штогод у чэрвені ў Дальве праводзяцца Акцыі Памяці, якія з 1995 года традыцыйна пачынаюцца з памінальнага богаслужэння святарамі Мінскага кафедральнага сабора. Мне здаецца, гэта вельмі важна — каб памяць вайны не перапынялася, перадавалася наступным пакаленням. Досыць красамоўная, на мой погляд, лічба: у 2016 годзе Хатынь наведала больш за 200 тысяч чалавек. Кожны, хто бывае ў загінулых вёсках-помніках, яшчэ лепш усведамляе, што трагедыя вайны не павінна паўтарыцца ніколі.

**Таццяна ВІЧЫК.**

# І МЕЖ НЯМА ДЛЯ ДУШЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пра жанчыну адзін з арганізатараў папярэдняй выстаўкі сказаў, што нападлову гэта яе карціны. Сапраўды так. Яна даглядае сына ўжо 37 гадоў. Яе душэўнае святло, якое можна назваць мацярынскім подзвігам, хутчэй за ўсё, і стала яму апорай, што не дала замкнуцца ў сабе, раззлавацца на ўвесь свет і засяродзіцца на сваіх праблемах.



Анатоль Галушка з дзяцінства вызначаўся музыкальнасцю. А вось мастацкіх здольнасцяў за сабой асабліва не заўважаў. Ну, хіба настаўнік малявання ў школе часам падхвальваў. Аднойчы, лежачы тварам да сцяны, паспрабаваў нешта намаляваць на шпалерах, заціснуўшы аловак зубамі. Нечакана атрымалася. Так і пачалося яго захапленне жывапісам. Амаль праз дваццаць гадоў пасля траўмы. Потым вучыўся пісаць фарбамі, што для чалавека ў яго стане нашмат цяжэй. З часам Анатоль стварыў сваю тэхніку жывапісу, у нечым унікальную. Ён не можа правесці доўгую лінію — таму піша маленькімі кароткімі штрыхамі. Піша лежачы на баку. Тэхніцы мастацкага пісьма ён нідзе не вучыўся, з мастацкай адукацыі — толькі школьныя ўрокі малявання. Піша так, як падказвае сэрца, як адчувае душа. І найбольш родную прыроду. Раней ствараў свае работы па памяці, потым сябры і родныя сталі арганізоўваць выезды на эцюды.

Відавочна, цяжка было б Анатолю без падтрымкі сяброў. Такіх, напрыклад, як Валерый Гапееў, пісьменнік, супрацоўнік Івацэвіцкай раённай газеты. Менавіта Валерый заўважыў «іскрынку» і заахвоціў Анатоля пісаць вершы на роднай мове. Бо першую спробу зарыфмаваць нешта па-руску Валерый жорстка раскрытыкаваў. Крытыкам ён быў строгім, не рабіў скідак на стан здароўя пачаткоўца. Анатоль прыслухаўся да парад, шмат чытаў, працаваў над сабой. Потым пайшлі вершы, у якіх няма штучнасці, хлусні, — толькі жывая душа, яе перажыванні, пачуцці.

*Узнімецца дух нескароны*
*Да самых таемных*
*вяршынь.*
*Няма для душы*
*забаронаў...*
*І межаў няма для душы.*

Гэта, несумненна, выпакутаваныя радкі, але надзвычай праўдзівыя. Бо аўтар здолеў узняцца над уласным болем, над сваёй нерухомасцю, і сваёй творчасцю разбурыў перашкоды, што ўзніклі з-за абмежавання магчымасцяў. Такое даецца не кожнаму...

Следам за вершамі пісаліся эсэ, якія разам з паэзіяй увайшлі ў зборнік «Сляды на пяску». На прэзентацыю гэтай кнігі пяць гадоў таму ў Магіліцах сабраліся ўсе жыхары вёскі. І вось нядаўна ўбачыла свет новая кніга паэзіі і прозы «Яблычны спас».

З яе выхадам аўтара павіншавалі яшчэ раз падчас адкрыцця выстаўкі жывапісу. Было сказана шмат добрых слоў у адрас 54-гадовага мастака, чалавека, які адбыўся, якім ганарацца родныя і землякі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Надвор'е

# КУРС — НА ПАЦЯПЛЕННЕ!

## У краіну прыходзіць лета

**«Ну сапраўды, колькі ўжо можна», жартуюць самі сіноптыкі і нарэшце прагназуюць доўгачаканае летняе надвор'е. Пачатак лета сёлета выдаўся халаднаватым, тэмпературны фон першых двух тыдняў чэрвеня быў у асноўным на 1—2 градусы ніжэй за кліматычную норму і толькі па паўднёвым захадзе складаў каля нормы, але цяпер надвор'е палепшыцца.**

Так, 16 чэрвеня ў краіне чакаецца да 26 градусаў цяпла, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя.

У суботу, 17 чэрвеня, пад уплывам паветраных мас з Польшчы пройдуць кароткачасовыя дажджы па паўднёва-заходняй частцы краіны, у асобных раёнах — навальніцы. Ноччу і днём магчымы туман. Тэмпература ўначы 8—15 градусаў цяпла, па паўночным усходзе яна панізіцца да 6—7 градусаў. Тэмпература днём складзе 16—23 градусы, па паўночна-ўсходняй частцы краіны — да плюс 25 градусаў.

У нядзелю, 18 чэрвеня, надвор'е ў Беларусі будзе фарміраваць пераважна вобласць павышанага атмасфернага ціску. Будзе без ападкаў, толькі ўначы па паўднёва-заходняй частцы пройдуць кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ноччу складзе 6—13 градусаў, днём максімальныя паказчыкі будуць на ўзроўні 21—27 градусаў вышэй за нуль.

У пачатку наступнага тыдня чакаецца цёплае надвор'е. У панядзелак і аўторак, 19—20 чэрвеня, на пераважнай частцы тэрыторыі Беларусі захавацца ўплыў вобласці павышанага ціску. У панядзелак будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень па поўначы краіны чакаецца кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Тэмпература паветра ноччу складзе 9—16 градусаў, днём чакаецца 22—28 градусаў вышэй за нуль.

У аўторак, 20 чэрвеня, таксама будзе пераважна без ападкаў, кароткачасовыя дажджы і навальніцы не выключаны толькі ў паўночна-заходніх раёнах. Тэмпература ноччу — 10—17 градусаў, днём сіноптыкі прагназуюць 22—27 градусаў цяпла, а па паўднёвым захадзе — да плюс 29.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ПРАЗ СЯБРОЎСТВА — У СВЕТ МАСТАЦТВА

**У габеленавай зале Мінскага дзяржаўнага каледжа імя М. І. Глінкі адбылося першае чытанне перакладу на беларускую мову паэмы "Лучафэрул", напісанай класікам румынскай нацыянальнай паэзіі Міхаем Эмінэску.**



**Урачысты момант абмену дакументамі Дамовы аб міжнародным супрацоўніцтве паміж беларускім і румынскім каледжамі ў сферы культуры.**




**Аб тым, як вядомая паэма перакладалася з румынскай мовы на беларускую, расказвае паэтэса Юлія АЛЕЙЧАНКА.**

ПЕРАКЛАД, які зрабіла адказны сакратар часопіса «Полымя», паэтэса Юлія Алейчанка, прагучаў у незвычайным выкананні: яго чыталі па чарзе на румынскай, беларускай, рускай мовах. Разам з навучэнцамі і настаўнікамі каледжа вершаваны твор слухалі жаданыя госці — пасол Румыніі ў Рэспубліцы Беларусь Віарэл Машану, навучэнцы і выкладчыкі румынскага ліцэя імя Канстанціна Брэілою.

Шляхі сяброўства не ўпершыню прыводзяць у сталіцу Беларусі замежных дзеячаў мастацтва. Дзякуючы плённым грамадскім сувязям напрыканцы мінулага года ў Мінску можна было пабываць на румынска-беларускай выстаўцы скульптуры, жывапісу і графікі, убачыць выступленне артыстаў румынскага тэатра «Пас спарту».

Прэм'ернае чытанне перакладу паэмы «Лучафэрул» на беларускую мову папярэднічала яшчэ адной знакавай падзеі. Перад прысутнымі ва ўрачыстай абстаноўцы адбылося падпісанне Дамовы аб міжнародным супрацоўніцтве паміж беларускім і румынскім каледжамі ў сферы культуры.

Першым вынікам такога супрацоўніцтва ў той жа дзень стаў цудоўны канцэрт, дзе ў выкананні навучэнцаў мінскага каледжа і іх замежных гасцей прагучалі лепшыя творы музычнай спадчыны нашых народаў.

**Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.**

# «ЗНАЙСЦІ ВЫЙСЦЕ МОЖНА З ЛЮБОЙ СІТУАЦЫІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёння кампаніі перажываюць нялёгкія часы, а таму пра адукацыю сваіх супрацоўнікаў кіраўнікі думаюць не ў першую чаргу. А такога, як зараз робіцца ў Мінску, калі людзі ідуць і самі ўкладаюць грошы ў сваю адукацыю, у рэгіёнах пакуль няма. Але мы актыўна праводзім папулярызацыю навучання сярод насельніцтва, запрашаем на сустрэчы, прэзентацыі праграм, тлумачым даступнасць і важнасць бізнес-адукацыі.

***— Колькі часу трэба вучыцца ў вашых школах? І хто вашы выкладчыкі?***

— Нашы выкладчыкі не маюць прывязкі да нейкіх універсітэтаў. Яны акрэдытаваны ў большай ступені еўрапейскімі вучэбнымі ўстановамі. У кожнай нашай школы ёсць свае партнёры — універсітэт Вялікабрытаніі, Польшчы, Нямецкая акадэмія кантролінга і фінансаў. Мы працуем па ліцэнзіі Міністэрства адукацыі і маем магчымасць выдаваць пасведчанні аб праходжанні павышэння кваліфікацыі, даведкі аб адукацыі.

Нашы школы — гэта пэўныя кірункі, вучыцца па якіх, у залежнасці ад тэмы і пытання, можна ад 1 дня да 10 месяцаў. На 10 месяцаў разлічаны кваліфікацыйныя праграмы па менеджменце, маркетынгу і гэтак далей. Слухач пры праходжанні поўнага курса атрымлівае пасведчанне аб павышэнні кваліфікацыі.

Нашы класы абсталяваны інтэрактыўнай відэасістэмай, якая дазваляе ажыццяўляць разнастайныя сустрэчы, мерапрыемствы, арганізоўваць вучэбны працэс на адлегласці. Каля 60% часу прысвячаецца практычнай адпрацоўцы заданняў. Ніякія лекцыі і падручнікі не заменяць навыку. Мы гуляем, рашаем задачы, мадэлюем сітуацыі, якія дазваляюць выпрацоўваць пэўны механізм паводзін.

***— Хто часцей за ўсё звяртаецца па вашы паслугі?***

— Сярод нашых выпускнікоў дырэктар кампаніі «Тэхнапласт» Міхаіл Паддубны, топ-менеджары групы кампаній СМІТ (завод палімерных труб), «Сервалюкса», «Белвеста», «Анегі», «Санта-Брэмара». У нас пастаянна вучацца супрацоўнікі «Белтэлекама», магілёўскага прадпрыемства «Стужка», «Магілёўліфтмаша». Але ўсё яшчэ мала кампаній, якія адкрыты для зносін і гатовыя вучыцца. Пры гэтым усе разумеюць, што тых жа спецыялістаў па продажах трэба пастаянна адукоўваць, абнаўляць іх веды хоць бы раз у паўгода. Калі доўгі час круцішся ў адным і тым жа, вока, як той казаў, замыльваецца, пачынаеш дапускаць памылкі. Акрамя гэтага, ёсць маса пытанняў, якія трэба вырашаць з незадаволенымі кліентамі. Існуе нават такое паняцце, як канфлікт-менеджмент, калі вучышся паводзінам у канкрэтных сітуацыях. Гэта захоўвае ад эмацыянальнага выгарання.

***— Нядаўна дзякуючы вам быў рэалізаваны вельмі карысны сацыяльны праект для людзей з абмежаванымі магчымасцямі...***

— Так. Алеся Цумарава з праектам «Тэрыторыя людзей» стала адной з трох фіналістаў рэгіянальнага этапу нашага конкурсу прадпрымальніцкіх ідэй. І два з іх, у тым ліку Алеся, перамаглі ў Мінску. У нас ужо былі цікавыя сацыяльныя праекты. Напрыклад, «Дзённічак будучай мамы» Ані Цітовіч па стварэнні практычнага дапаможніка для будучай маці. Але такіх, якія датычыліся б людзей з абмежаванымі магчымасцямі, яшчэ не было. Яго сутнасць у тым, каб стварыць пляцоўку для занятасці такіх людзей і, як мінімум, аўтаматызаваць краму, якая дазволіць прадаваць зробленыя іх рукамі вырабы. Навізна ў тым, што стаўка робіцца не столькі на хэнд-мэйд, бо цяпер шмат рамеснікаў, а на тое, каб вучыцца рабіць рэчы эксклюзіўныя. Памяшканне, дарэчы, ёй ужо выдзелілі.

***— Якая карысць ад удзелу ў вашым конкурсе прадпрымальных ідэй? І на што ён разлічаны?***

— Ён разлічаны на тое, каб прыцягнуць як мага больш адораных людзей, ахвотных развіваць свае ідэі і адаптаваць іх да рэалій. Таму што ідэямі можна фантанаваць, але яны могуць быць нежыццяздольнымі. Не ва ўсіх атрымліваецца стварыць са сваёй ідэі сімпатычную бізнес-мадэль. Асаблівасць конкурсу ў тым, што мы вучым нашых удзельнікаў усім тым пазіцыям, якія дапамогуць развіць праект, — продажам, маркетынгу, фінансавым тонкасцям, бізнес-планаванню. У якасці экспертаў і членаў журы запрашаем людзей, якія займаюцца бізнесам, — уласнікаў, кіраўнікоў кампаній. Яны дапамагаюць накіраваць пачаткоўца, недзе яго падтрымаць. Нашым генеральным партнёрам з'яўляецца «Альфа-банк», які прадастаўляе вельмі добрыя ўмовы на банкаўскія паслугі для найбольш перспектыўных людзей. Былі выпадкі, калі нашы ўдзельнікі знаёміліся цераз нас з бізнесменамі, а потым рабілі з імі нейкія сумесныя прадукты. Пераможцы фінальных спаборніцтваў вельмі часта атрымліваюць гранты на вучобу, сертыфікаты на вучэбныя курсы, якія дазволяць «пракачаць» свае веды ў той або іншай сферы.

***— Прывядзіце хоць адзін прыклад удалага супрацоўніцтва практыкуючага бізнесмена і пачаткоўца.***

— У нас быў праект, які спецыялізаваўся на вытворчасці кандытарскіх вырабаў. На конкурсе дзяўчына пазнаёмілася з вытворцам плаўленых сыроў, і яны сумесна пачалі працаваць. Восенню кампанія выпусціла дэсерт з рознымі напаўняльнікамі з выявай канкурсанткі на этыкетцы. Цяпер дзяўчына працягвае развіваць свой праект.

Самае галоўнае ў конкурсе даць зразумець, што грошай лёгкіх не бывае, трэба ўвесь час працаваць. Калі цябе праінвеставалі, павінна быць цвёрдая канцэпцыя далейшага развіцця. Усё залежыць ад смеласці і жадання выходзіць на ментараў, выслухоўваць, прымаць да ведама іх парады і развівацца. Мы вельмі радуемся, калі нашы выхаванцы з няўпэўненых у сабе і ў сваёй ідэі людзей за тры месяцы падрыхтоўкі вырастаюць у вынаходнікаў, якія ведаюць сабе цану. Дзеля гэтага трэба было працаваць. Гэта каласальны рывок наперад.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## Візітоўка

**Бізнес-школа ІПМ створана па мадэлі еўрапейскіх устаноў бізнес-адукацыі (мае міжнародную акрэдытацыю якасці IQA) і займаецца падрыхтоўкай бізнесменаў, кіраўнікоў і спецыялістаў па пяці кірунках (школах) — продажы, менеджмент, маркетынг, фінансавы кантроль і развіццё вытворчых кампаній. Акрамя гэтага, тут рэалізуюць праграму «Акадэмія ўласніка», якая разлічана на людзей, што працуюць у бізнесе. Навучанне вядзецца па праграме Executive MBA універсітэта Казьмінскага (Польшча), чыім філіялам з'яўляецца бізнес-школа ІПМ, і ажыццяўляецца ў рамках гранта Фонду Еўразія.**


**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
13.06.2017 г.
Красинским А.Д.

УНП 600422579

УТВЕРЖДЕНО
Общим собранием участников
ООО «ДЕКО-ПЛАСТ»
02.05.2017 (Протокол №б/н)

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ПЯТОГО ВЫПУСКА

**Общества с ограниченной ответственностью «ДЕКО-ПЛАСТ» (ООО «ДЕКО-ПЛАСТ»)**

г. Минск 2017 г.

Общество с ограниченной ответственностью «ДЕКО-ПЛАСТ» (далее – Эмитент) на основании Протокола заседания Общего собрания участников от 02.05.2017 №б/н вносит следующие изменения в Проспект эмиссии жилищных облигаций пятого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «ДЕКО-ПЛАСТ» (номер государственной регистрации 5-200-02-2305, дата государственной регистрации 01.10.2014) (далее – Проспект эмиссии):

1. Пункт 1.2. Проспекта эмиссии изложить в следующей редакции:

«**1.2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail).**

Место нахождения эмитента: Республика Беларусь, 220049, г. Минск, ул. Кнорина, д. 17, 5-й этаж, офис 3;

телефон/факс: 8 (017) 3464137;

электронный адрес (e-mail): info@tapas.by, сайт: www.tapas.by».

2. Пункт 1.4. Проспекта эмиссии изложить в следующей редакции:

«1.4. Номера расчетного счета эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций, наименование обслуживающего банка.

Средства при проведении открытой продажи жилищных облигаций настоящего выпуска уплачиваются в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь, в безналичной форме, в белорусских рублях, на расчетный счет: №3012306950019 в закрытом акционерном обществе «Минский транзитный банк» (220007, г. Минск, ул. Толстого, 10, код 153001117) до 04.07.2017; №BY83MTBK30120001093300069872, в закрытом акционерном обществе «Минский транзитный банк» (220007, г. Минск, ул. Толстого, 10, код MTBKBY22) с 04.07.2017.».

3. Пункт 1.7. Проспекта эмиссии изложить в следующей редакции:

«**1.7. Размер уставного фонда эмитента.**

Уставный фонд эмитента составляет 556 000 (пятьсот пятьдесят шесть тысяч) белорусских рублей.».

4. Пункт 1.11. Проспекта эмиссии изложить в следующей редакции:

**«1.11. Исполнительный орган эмитента, с указанием фамилии, имени, отчества, года рождения, образования, всех занимаемых должностей, в том числе вне органов управления эмитента, в настоящее время и за три предшествующих года, размер доли в процентах в уставном фонде эмитента.**

Функции исполнительного органа – директора эмитента переданы по договору на управление компанией № 38/УПиКО-2014 от 11.08.2014. управляющей компании ООО «ТАПАС», директор – Требенок Николай Николаевич, действующий на основании Устава:

| | | |
|---|---|---|
| Дата рождения | 13.04.1979 | Идентификационный номер: 3130479A062PB9 |
| Образование | высшее | Белорусская государственная политехническая академия |
| Занимаемые должности за последние три года и в настоящее время: | | |
| с 01.10.2014 г. по 08.06.2016 | Главный архитектор проекта ООО «ЭСИЭС» | |
| с 22.06.2016 по 02.10.2016 | Начальник отдела инжиниринга ООО «ТАПАС» | |
| с 03.10.2016 по 08.12.2016 | Заместитель директора по строительству ООО «ТАПАС» | |
| с 09.12.2016 по настоящее время | Директор ООО «ТАПАС» | |

Доли в уставном фонде Эмитента, а также в зависимых хозяйственных обществах Эмитента не имеет.».

5. Пункт 2.2 Проспекта эмиссии изложить в следующей редакции:

**«2.2. Форма выпуска и вид облигаций. Объем эмиссии, количество, серия и номера облигаций.**

| | |
|---|---|
| Форма выпуска и вид облигаций | Бездокументарные, именные, конвертируемые |
| Объем эмиссии облигаций | 1 830 000 (один миллион восемьсот тридцать тысяч) белорусских рублей |
| Количество облигаций | 3000 (три тысячи) штук |
| Серия облигаций | ДКП-5 |
| Номера облигаций | 000001-003000 |

».

6. В пункте 2.3 Проспекта эмиссии слова «6 100 000 (шесть миллионов сто тысяч) белорусских рублей» заменить словами «610 (шестьсот десять) белорусских рублей».

7. Подпункт 2.4.2. пункта 2.4. Проспекта эмиссии изложить в следующей редакции:

«2.4.2. Объектом жилищного строительства является Жилой дом №2 по генеральному плану (4-секционный 14, 15, 16, 18-этажный жилой дом), общая продолжительность строительства предусмотрена 55,1 месяцев.

Проектно-сметная документация по объекту «Многоэтажные жилые дома со встроенно-пристроенными объектами торговли, административными помещениями, полузаглубленной и наземной автостоянкой в жилом районе Лебяжий в г. Минске» утверждена приказами Эмитента от 12 марта 2014 г. №12-03/14-1, от 17 февраля 2017 г. №3.

Заключения по архитектурному проекту: от 14 февраля 2017 г. №941-15/16 подготовлено Республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза» в дополнение к заключению государственной экспертизы от 10 июня 2013 г. № 410-15/13.

Права Эмитента жилищных облигаций на земельный участок, необходимый для обеспечения строительства жилого дома №2, удостоверены Свидетельством (удостоверением) №500/962-2938 о государственной регистрации в отношении земельного участка с кадастровым номером 500000000007006809.».

8. Часть первую пункта 2.5 Проспекта эмиссии жилищных облигаций изложить в следующей редакции:

«1. Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС» на сумму 1 550 000 (один миллион пятьсот пятьдесят тысяч) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 02.05.2017 № б/н.

Место нахождения поручителя: 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17, 4-й этаж, офис 14.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 101484246.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.01.2017 составляет 12 212 тыс. белорусских рублей; на 01.04.2017 составляет 21 632 тыс. белорусских рублей.».

9. Абзацы первый – четвертый части второй пункта 2.5 Проспекта эмиссии жилищных облигаций изложить в следующей редакции:

«2. Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС ПЛЮС» на сумму 280 000 (двести восемьдесят тысяч) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 30.09.2015 №б/н.

Место нахождения поручителя: Республика Беларусь, 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17, 4-й этаж, офис 19.

УНП (учетный номер плательщика) поручителя: 190976309.

Стоимость чистых активов поручителя на 01.01.2015 составляет 9 566,7 тыс. белорусских рублей, на 01.07.2015 составляет 6 311,7 тыс. белорусских рублей.».

10. Абзац первый пункта 2.7. Проспекта эмиссии изложить в следующей редакции:

«Размещение облигаций осуществляется Эмитентом путем открытой продажи облигаций ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Республика Беларусь, 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17, 5-й этаж, офис 3. Открытая продажа облигаций осуществляется физическим и (или) юридическим лицам в соответствии с законодательством Республики Беларусь путем заключения соответствующего договора.».

11. Остальной текст Проспекта эмиссии остается без изменений.

Директор
управляющей компании Эмитента Н.Н. Требенок
Ответственный бухгалтер Эмитента Е.Н. Марчук

Поручители:
Первый заместитель директора
ООО «ТАПАС» С.П. Ставер

Первый заместитель директора
ООО «ТАПАС ПЛЮС» Д.А. Орловский

Начальник отдела ценных бумаг
и инвестиций Департамента финансовых
рынков ОАО «БПС-Сбербанк» А.Н. Столбанов



# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# ШТО Ў «ГОЛАСЕ» ТАБЕ

## Дзеля чаго беларусы імкнуцца на «першую кнопку»?

**Ужо некалькі тыдняў АНТ транслюе новы музычны праект расійскага Першага канала «Пераможца», дзе таленавітыя артысты спаборнічаюць за славу і галоўны прыз — 3 мільёны рублёў. Нядаўна там феерычна выступілі і беларускія артысты — гурт Івана Вабішчэвіча, больш вядомага на сцэне як Дзядзя Ваня. Неўзабаве ў Маскве стартуюць праслухоўванні на чарговы сезон «Голасу» (расійская версія сусветна вядомага шоу «The Voice»), у якім — магу пабіцца аб заклад, — таксама адзначацца беларусы. Чым так вабяць нашых выканаўцаў тэлеконкурсы ў суседніх краінах і ці многім удаецца ўхапіць за хвост птушку шчасця, творчага росту і матэрыяльнага дабрабыту?**

Пра «нашых у тэлевізары» гутарым **з прадзюсарам, арт-дырэктарам музычнага праекта «Дзядзя Ваня» Інай РАДАЕВАЙ**, якая падзялілася са «Звяздой» уражаннямі ад работы экспертам на шоу «Пераможца», растлумачыла, чаму ў Беларусі дагэтуль няма свайго «Голасу», а таксама расклала па палічках схему папулярных айчынных і расійскіх музычных тэлепраектаў.

— «Пераможца» — праект новы нават для расійскага тэлебачання, не кажучы ўжо пра нас. Для гэтага фармату шукалі артыстаў разнажанравых, далёка не ўсе з якіх маюць конкурсны вопыт, практыку выступлення на вялікіх пляцоўках — сярод канкурсантаў аказалася нямала «сырых», але перспектыўных пачаткоўцаў, кавер-бэндаў і г. д. Спярша музычныя рэдактары расстаўлялі ўдзельнікаў у пары, прыкладна роўныя па жанры і ўзроўні, а далей з кожным выбываючым удзельнікам шоу рабілася ўсё цікавейшае, бо расстаноўку сіл вызначалі ўжо не рэдактары, а жарабʼёўка. Калі ў адным раўндзе сустракаюцца прафесійная спявачка Вольга Кляйн з шалёнай энергетыкай і вельмі вопытны гурт, які не мае вопыту тэлевізійных здымак наогул, — быць абʼектыўным вельмі складана, і музычныя эксперты (а ў праекце іх 101 чалавек — спецыяльна, каб галасы не маглі падзяліцца пароўну. — **Аўт.**) часта губляліся. Я таксама лавіла сябе на тым, што планка ацэнкі «зʼязджае», а ў прафесіі ўсё ж хочацца быць у згодзе з сумленнем, таму ўвесь час трэба было шукаць залатую сярэдзіну. Мы ўсе, маю на ўвазе экспертаў, пасябравалі, але ў плане ацэнак у кожнага быў свой падыход. Прынамсі, я глядзела, наколькі ў таго ці іншага ўдзельніка, незалежна ад вопыту і рэгалій, ёсць перспектыва ў прафесіі. Калі бачыла, што артыст або калектыў можа далей расці, развівацца, быць цікавым гледачу і сабе, галасавала «за»; калі ж адчувалася, што чалавек дасягнуў сваёй столі — што называецца, не крыўдуй, забяры грошы і ідзі. Дарэчы, наконт грошай — асобная цікавая гісторыя. Паводле ўмоў праекта, той з удзельнікаў, хто не ўпэўнены ў сваіх сілах, можа не чакаць вынікаў галасавання, а ўзяць пэўную суму і пакінуць шоу. Дык вось, недзе тры праграмы гэтага ніхто не рабіў, і прадстаўнік галандскай кампаніі — уладальніцы фармату шоу, вельмі здзіўляўся: «Першы раз такое бачу, каб ніхто не браў грошы!» Ці то гэта звышупэўненасць



Баяніст-віртуоз Віталь ВАРАНКО.

у сваіх сілах, ці пераканане загадкавай славянскай душы ў тым, што ўзяць грошы сорамна... Апошняе, я лічу, архіглупства: не часта Першы канал вось так адразу дае артыстам і эфір, і вельмі прыстойную суму. Трэба сказаць, уменне адэкватна сябе ацаніць — вельмі важная якасць для творчага чалавека, і тут я ганаруся нашай суайчынніцай Аленай Пішчыкавай. Яна таксама была ў праекце, вельмі няблага сябе паказала (сачыце за эфірамі, хутка ўбачыце нашу зямлячку ў вельмі прыгожым вобразе!) і, зразумеўшы, што сапернік мацнейшы і ярчэйшы за яе, не разгубілася ў атмасферы тэлевізійнага пафасу і конкурснага мандражу, і ўзяла грошы. Малайчына, паўтару — ганаруся суайчынніцай!

***— Магу зразумець, навошта гэты праект Алене і іншым пачаткоўцам — магчымасць заявіць аб сабе, «раскрутка» і ўсё такое. А вось навошта ён Ваню Вабішчэвічу і іншым ужо вядомым беларускім выканаўцам — спроба прабіць столь галавой?***

— Ні ў якім выпадку. У нас абсалютна здаровы, цынічны прафесійны разлік. Нам з Ванем было зразумела, што сёння ніякае музычнае спаборніцтва не дасць яму новых вяршыняў — ён ужо ўсё даказаў, што жадаў, сам сабе і слухачам. Аднак, па-першае, заўжды цікава і карысна паварыцца ў творчай кухні такіх тэлепраектаў, абмяняцца вопытам з іншымі музыкантамі; па-другое, для выканаўцы, арыентаванага на рускамоўную аўдыторыю, эфіры на Першым канале лішнімі не бываюць, як не бывае лішняй і праца з іх — не нашымі — заробкамі.

***— Ты добра ведаеш знутры тэлешоу «Голас», конкурс «Новая хваля», цяпер і «Пераможцу». Паспяховае выступленне ў падобных праектах сапраўды адкрывае нашым артыстам заманлівыя перспектывы?***

— Трэба разумець, што ўсе праекты вельмі розныя. «Новую хвалю», нягледзячы на ўсепературбацыі з конкурсам, я заўжды буду пяшчотна любіць: за дзесяць дзён не толькі сам артыст, але і ўсе суправаджаючыя «пацярпелыя ад шоу-бізнесу», уся ягоная каманда праходзіць унікальныя творчыя ўніверсітэты, майстар-класы па ўсіх складовых шоу-бізнесу, ад сцэнічнага вобраза да аранжыровкі. Нічога падобнага таму, што і як робіць каманда Аляксандра Давыдавіча Рэўзіна, я за ўсё доўгае жыццё ў прафесіі не бачыла і штораз з задавальненнем вучуся ў гэтых настаўнікаў. «Голас» вучыць крыху іншым рэчам: там набіраюць прафесійных вакалістаў і вучаць іх спаборнічаць не толькі з сапернікамі, але і з самім сабой, што далей, то рабіць усё лепш, выступаць у камандзе і, галоўнае, вельмі хутка арыентавацца ў сітуацыі і выдаваць вынік. «Пераможца» і, напрыклад, «Галоўная сцэна» маюць больш жорсткі фармат, патрабуючы ўдыхнуць новае жыццё ў старую музыку. На Першым канале наогул вельмі жорсткія ўмовы працы. Усе мае калегі-рэдактары гатовыя ўсяляк дапамагчы, падказаць, спрацаваць на вынік, каб кожны артыст у «скрыні» быў яркім, бо ад гэтага залежаць і рэйтынгі праекта, і іхні прафесійны статус, — але тэрміны вельмі сціслыя, патрабаванні высокія, і калі ты не справішся — прабач, бывай.

І тым не менш усе гэтыя праекты зʼяўляюцца выдатнай стартавай пляцоўкай для заваявання новага гледача і для развіцця сябе, любімага. Здолееў ты скарыстацца шанцам — будзеш мець вынік.



Дзядзя Ваня на шоу «Голас».

Можна засвяціцца ў адным эфіры і запомніцца больш за фіналістаў, тут усе пытанні да самога артыста.

***— Нават самыя наіўныя гледачы здагадваюцца, што на тэлебачанні ўсё не так проста і прыгожа, як паказваюць у кадры: ёсць закулісныя інтрыгі і падводныя камяні. Што варта ўлічваць патэнцыйным зоркам, перш чым кідацца ў расійскія тэлепраекты?***

— Я сказала б, што расійскае тэлебачанне — не такое ўжо зубастае пудзіла, якога трэба баяцца. Але варта разумець, што ў кожным конкурсе ёсць свае фарматныя ўмовы, і пры ўсім тваім таленце і арыгінальнасці цябе могуць мякка, але настойліва папрасіць іх выконваць. Калі артыст гатовы да такіх перамен, яму пяцьдзясят пяць разоў усё дапамогуць і падкажуць. Яшчэ адзін момант: у шоу-бізнесе, як, зрэшты, у бізнесе наогул, існуюць інтрыгі, лабіраванне «сваіх» людзей, і трэба разумець, што на нейкім этапе ты можаш з гэтым сутыкнуцца, уключыць галаву і паспрабаваць абысці падобныя моманты. Трэцяя і, напэўна, галоўная заўвага — да ўдзелу ў праекце трэба загадзя рыхтавацца! Спадарства, сёння на YouTube ёсць усё і пра ўсё, у Instagram можна знайсці амаль усіх музычных рэдактараў Першага канала. Адзін з іх пастаянна праводзіць прамыя эфіры і адказвае на пытанні патэнцыйных удзельнікаў таго ж «Голасу», а тэлефон прадзюсара Яўгена Арлова ведае палова Масквы — так што не паляніцеся пацікавіцца, што ды як. І тады ўсё атрымаецца.

***— Калі параўноўваць беларускія і расійскія праекты знутры — праўда, што нашы больш бяззубыя ў сэнсе крытыкі артыстаў? Маўляў, нікога не хочацца пакрыўдзіць?***

— Ёсць момант крыўдаў і крыўдачак у адказ на крытыку, але не ў гэтым асноўнае пытанне. Я вельмі цёпла ўспамінаю «Акадэмію талентаў» на АНТ, дзе давялося папрацаваць, і мяркую, што гэты праект мог бы не саступіць «Голасу». Але ёсць нюансы, скажам, трансляцыі сігналу — на мантажы бачыш адну карцінку, а на экране — зусім іншую, значна менш якасную, ад якой адразу зʼяўляецца адчуванне мястэчковасці. Другі момант: Расію выручае вялікая геаграфія, а ў нас проста няма такой колькасці прафесійных кадраў, з якімі можна хутка і якасна зляпіць шоу-цукерку. Затое хапае «маладых талентаў», у якіх пасля аднаго-двух тэлеэфіраў з неверагодный хуткасцю «адрастаюць» і німб, і карона, і пачынаюцца такія капрызы, што мама дарагая! Даводзіцца працаваць з тым, што ёсць. А глядач міжволі параўноўвае тое, што робім мы, і тое, што ён бачыць на расійскіх тэлеканалах, — і, як правіла, параўнанне не на нашу карысць.

***— О, я ведаю дзве самыя частыя рэакцыі гледачоў: «Хто гэтыя людзі?!» — калі артыст чагосьці дасягае ў Беларусі, і «Дык гэта ж наш!» — калі той жа артыст «выстраліў» у расійскім ці ўкраінскім тэлешоу.***

— Яшчэ гадоў пяць-шэсць таму такія рэакцыі вельмі выразна прасочваліся, а сёння, на мой погляд, усё крыху змазаліся. У прыватнасці, сітуацыя з «Naviband» гэта пацвердзіла. Музыканты яшчэ далёка не архімегавыканаўцы, ім ёсць куды расці, але штосьці ў іх такое шчырае, сапраўднае праявілася, што сёлета выступленне нашых артыстаў на «Еўрабачанні» выклікала пазітыўныя эмоцыі, а не бязглуздую заўсёдную крытыку.

Дарэчы, калі мы самі сябе звыкла недаацэньваем, то сярод расійскіх дзеячаў шоу-бізнесу існуе меркаванне, што ў нашай краіне неймаверная колькасць таленавітых людзей. На кожным кастынгу многія выхадцы з Беларусі, прычым пераважна з рэгіёнаў, паказваюць сябе так ярка, што проста сківаць з падлогі падбіраеш. І нават калі яны не трапляюць у канкрэтны праект, іх адзначаюць і запрашаюць потым на розныя фестывалі.

***— На беларускім тэлебачанні няма свайго «Голасу» — таму, што мы яшчэ не дараслі або таму, што ён наогул не патрэбны?***

—Усё значна працэй: гэта занадта дарога. Беларускія тэлевізійнікі, магчыма, і не замарочваліся б, не выдумлялі ўласныя шоу талентаў, а набылі ўжо гатовы фармат і гналі б па накатанай, балазе франшызу сёння могуць сабе дазволіць набыць нават Нігерыя і Ангола. Аднак ўласна вытворчасць, прадакшн — кожная перадача вылівае ўшалёныя грошы, пачынаючы ад тэхнічнага абсталявання пляцоўкі да афармлення, і ніводны з існуючых беларускіх тэлеканалаў проста не пацягне гэтыя ўмовы.

І ўсё ж асабіста я лічу, што такі праект нам вельмі патрэбны — можа, на раскручаны брэнд прыйшлі б тыя, хто сёння едзе ў Маскву, і ўсе разам зрабілі якаснае беларускае шоу.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
tselyashuk@zviazda.by

## «СМАЧНАЕ ЛЕТА СА «ЗВЯЗДОЙ»

**Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на III квартал або на II паўгоддзе 2017 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 8 ліпеня 2017 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**



Набор мебели садовой Tarifa lounge wikbrw-std lounge

**Сярод падпісчыкаў 12 ліпеня 2017 года будуць разыграны 7 мангалаў Forester і суперпрыз — набор садовай мэблі Tarifa longe. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 22 ліпеня 2017 г.**



Мангал Forester BC-781 с шампурами

**Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30 верасня 2017 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або II паўгоддзе 2017 г. і пашпарта. Пасля 30 верасня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Смачнае лета са «Звяздой» чытайце ў нумары 95 газеты «Звязда» ад 23.05.2017 г.**

**Тэлефон для даведак: (017) 284 44 04.**

**Тэрмін правядзення гульні — з 26.05.2017 па 30.09.2017.**

**Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №3002 ад 16.05.2017 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.**

### Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2017 года

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска афармлена і аплачана ў** ____________________
(аддзяленне сувязі)

на III квартал або II паўгоддзе 2017 года

**Хатні адрас і тэлефон** (абавязкова) [ ] (індэкс) ________

____________________

____________________

**Удачы ў розыгрышы!**

## Серада, 21 чэрвеня

### Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 23.45 Зона Х.
9.10, 10.05, 22.00 Серыял «След».***
10.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.00 Дзіцячы доктар.
11.35, 12.10, 20.00 Серыял «Лесвіца ў нябёсы».*
13.05 Дзень у вялікім горадзе.
14.00 Серыял «Маёр і Магія».***
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25 Нашы.
15.45, 16.05 «Выратуйце нашу сям'ю».***
17.35 Беларуская часінка.
19.20, 0.00 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.45 Актуальнае інтэрв'ю.
0.35 Дзень спорту.
0.50 Серыял «Паляўнічыя на брыльянты».***

### Беларусь 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 22.05 Тэлебарометр.
9.05, 18.50 Меладрама «Жамчужына палаца».*
10.20 Рэальны свет.
10.50, 16.35 Серыял «Кухня».***
11.55, 22.10 «Бітва экстрасэнсаў. 11-ы сезон. Апакаліпсіс».
14.05, 17.45 «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
15.20 «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
16.05 «Багіня шопінгу». Фэшн-шоу.
20.05 «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
22.00 Спортлато 5 з 36, КЕНО.

### Беларусь 3

7.00 «Дабранак».
7.40 «Беларуская кухня». Грыбок.
8.10, 12.00, 20.15 «Калейдаскоп». Навіны культуры.
8.25, 12.15, 15.15, 20.30, 22.50 «Гэты дзень».
8.30, 18.55 «Фурцава». Драма.***
9.25, 13.40 «Вязень замка Іф». Драма.*
11.00, 15.20 «Чатыры танкісты і сабака». Маст. фільм.*
11.55 М/ф.0
12.20 «Наперад у мінулае».
12.45 «Тэатр у дэталях». Опера Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь «Аіда».
13.15 «СССР — музыка пад забаронай». Гурт «Кіно».
16.15 «Славянскі базар» у Віцебску-2010».
17.10, 21.05 «Стралковая зброя Другой сусветнай». Дак. фільм.*
17.45, 21.45 «Пастарайся застацца жывым». Драма.*
19.50 «Выпрабаванне». «Крэпасць» (з субцітрамі).
20.40 «Калыханка».
22.55 «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага мастака Беларусі Гаўрыіла Вашчанкі.

### Беларусь 5

8.00 «Нашы».
8.20 Спорт-кадр.
8.50 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. ФК «Гомель» — «Крумкачы» (Мінск).
10.45 Жанчыны і спорт.
11.15 Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Плэй-оф.
13.00 Гульні «на вырост».
13.30, 23.10 Тэніс. Турнір WTA.
14.30, 19.50 Бокс. Чэмпіянат Еўропы. 1/4 фіналу.
17.00 Козел пра футбол.
17.20 Слэм-данк.
17.50 Футбол. Кубак канфедэрацый. Расія — Партугалія. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
21.00 Футбол. Кубак канфедэрацый. Мексіка — Новая Зеландыя. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
23.00 Спорт-цэнтр.

### АНТ

6.00, 6.30, 7.00 (з субцітрамі), 7.30, 8.00 (з субцітрамі), 8.30, 9.00 (з субцітрамі), 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
6.05, 8.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!»*
10.20 «Смак».*
11.05, 13.05, 16.15, 18.15 (з субцітрамі), 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Модны прыгавор».
12.10, 23.45 «Сам-насам з усімі».***
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».***
14.15, 16.20 «Час пакажа».***
16.55 «Давай пажэнімся!»***
18.20 «Кантрольная закупка».
18.55 «Удача ў прыдачу!» Дзённік.
19.00 «Няхай гавораць».***
20.00 Час.
21.05 Серыял «Мажор-2».***
23.05 «Вячэрні Ургант» у Санкт-Пецярбургу.***
0.40 Начныя навіны.

### СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 23.00 «СТБ-спорт».
8.30 «Тайны Чапман».***
9.30, 17.35 «Званая вячэра».
10.40, 18.35 «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».***
11.30 «Глядзець усім!»***
11.50, 1.25 «Меч». Серыял.***
13.50 «Участак лейтэнанта Качуры». Серыял.***
15.40 «Вадзіць па-руску».***
16.05 «Аўтапанарама».
16.50 «Салдаты і афіцэры». Серыял.
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Сакрэтныя тэрыторыі».***
22.00 «Глядзець усім!»***
23.05 Драма «Брэсцкая крэпасць».*

### МІР

6.45 М/ф «Маша і Мядзведзь».0
7.00 Добрай раніцы, свет!***
8.35 «Няма праблем».***
10.00 «Любімыя акцёры», Леў Дураў.*
10.30, 13.15 Серыял «Сямнаццаць імгненняў вясны».*
13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
15.00 Дак. фільм «Сямейныя драмы».***
16.15 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».***
19.20, 2.30 Серыял «Закон і парадак».***
23.10 Маст. фільм «Страшная прыгажуня».*
0.50 Маст. фільм «Апошні забой».***
5.30 М/ф.0

### РТР—Беларусь

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.40 «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
12.00 «60 хвілін». Ток-шоу.
13.20 «Пакой смеху».
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.35 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.40 «Прамы эфір».
17.20 Серыял «Пыльная работа».
19.15, 20.40 Серыял «Чэрчыль».
22.00, 23.10 Серыял «Плюс Любоў».
0.00 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
6.05 Кватэрнае пытанне.
7.10, 8.05 Серыял «Вісякі».***
8.55 Серыял «Мухтар. Новы след».***
9.40, 23.05 «НЗ.by».
10.20 Серыял «Ляснік».***
12.00 Суд прысяжных.
13.25, 16.30 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
14.05 Серыял «Дарожны патруль».***
17.05 Серыял «Сведкі».***
19.45 Серыял «Маёр Сакалоў. Гульня без правіл».***
23.25 «Вынікі дня».
23.55 Серыял «Пагоня за ценем».***

### 8 канал

7.00, 15.55, 19.15, 21.00, 23.55 «Надвор'е».
7.05 М/ф «Дамба».
8.10 Серыял «Выратавальца боса».
8.55, 17.15 Серыял «Грандатэль».
10.15 «Сябры дзядулі Марка».
10.30 «Адшукваецца адпачынак».
11.00 Драма «Вяртанне».
12.50, 19.20 Серыял «Шэрлак».
14.20 Камедыя «Сем нявест яфрэйтара Збруева».
16.00 «Мультпарад».
16.25 Серыял «Паміж намі кажучы».
18.45 «Мой любімы гадавальнец».
20.50 «Вечарніца».
21.05 Прыгоды «Прагулка».
23.05 Серыял «Тыран».

### ВТБ

6.00 «Турбаміксер».***
6.30, 4.20 «Ералаш».0
7.30, 3.20 М/ф «Ёка».0
7.55, 3.45 М/ф «Фіксікі».0
8.10, 4.00 М/ф «Смяшарыкі».0
8.30, 14.40, 19.00 Серыял «Атэль «Элеон»-2.***
9.30 Камедыя «Карпаратыў».*
11.15 Скетч-шоу «6 кадраў».***
12.00, 2.15 «Дурні і дарогі».***
12.30, 5.10 Серыял «Метад Лаўровай».***
13.30, 20.10 Серыял «Дах свету».***
15.50, 0.50 Серыял «Васьмідзясятыя-5».***
16.20 Серыял «Закрытая школа-3».***
17.20 Серыял «Сям'я 3D».***
17.50, 23.20 «Уральскія пельмені».***
21.20 Камедыя «Добры дзень, мы ваша крыша!»*
0.00 Серыял «Карабель».***
1.15 «Лаві момант».***
1.35 Серыял «Бязмоўны сведка».***
2.35 «Не можа быць!»***

### Культура

6.30 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.30, 23.15 Навіны культуры.
10.15, 1.55 «Назіральнік».
11.15, 21.35 «Каломба». Серыял.
12.55 «Пешшу...» Масква вясковая.
13.25, 20.40 «Роўная найвялікшым біткам». Дак. серыял.
14.15 «Леў Кісялёў: «Я ўсё яшчэ зачараваны навукай...» Дак. фільм.
15.10 «Гістарычныя падарожжы Івана Талстога».
15.40 «Іван». Маст. фільм.
16.50 «Кінескоп». XXVIII Адкрыты расійскі кінафестываль «Кінатаўр».
17.30 Жыццё цудоўных ідэй. «Унутрыклетачны рамонт».
18.05 Аляксандр Сладкоўскі і Дзяржаўны сімфанічны аркестр Рэспублікі Татарстан. П. Чайкоўскі. «Манфрэд».
18.55 Сусветныя скарбы.
19.15 «Добрай ночы, малыя!»
19.45 Галоўная роля.
20.00 Штучны адбор.
23.30 Мастсавет.
23.35 «Гарык». Дак. фільм.
0.30 «Жыццё спачатку». Маст. фільм.
1.45 Колер часу. Ар-дэка.

### Настальгія

6.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Аквариум». 2005 год.***
7.10, 13.10, 19.00 Тэлефільм «Жыццё Мацвея Кажамякіна».***
8.20, 9.40, 11.00, 12.50, 15.40, 17.00, 21.40, 23.00, 5.50 Музычная настальгія.*
8.35 «Час пік» з У. Лісцьевым. 1994 год.*
9.00, 15.00, 21.00 «Мінулы час».*
10.00, 16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР».*
11.20, 23.20 «Сядзі і глядзі». Музычна-парадыйная праграма.***
11.35 «Час пік» з Андрэем Разбашам.*
12.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Як мы паступалі ў інстытут». 2007 год.***
14.30 Праграма «Ранішняя пошта». 1986 год.*
17.25 Дак. фільм «Не ў адзін дзень Масква будавалася».*
18.00 «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год.*
20.10 Тэлеспектакль «Кошка на радыятары». 1977 год.***
23.35 «Час пік» з Дзмітрыем Кісялёвым. 1996 год.*
0.00 «Ранішняя пошта». 1989 год.*
0.35 «...Да 16 і старэйшым». 1988 год.***
1.25 «КВЗ-87». НДУ — ДДУ.***
3.10 «Зямля — Паветра». Дэцл. 2003 год.***
4.30 Маст. фільм «Кантрабанда».***

### EuroSport 1

3.30, 7.00, 14.00 Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
4.00 Снукер. UK Championship. Фінал.
6.00, 13.00, 23.30 Аўтагонкі. «24 гадзіны Ле-Мана».
8.00, 10.00, 15.30, 2.30 Футбол. Чэмпіянат MLS.
8.30, 10.30 Футбол. «ФІФА».
9.00 Watts. Топ-10.
9.35, 15.00 Ралі. ERC.
11.00, 18.30, 21.45, 0.35 Снукер. «Мастэрс». Фінал.
12.55, 15.25, 21.35 Зімовыя віды спорту. «У пагоні за гісторыяй». Ліндсі Вон.
16.30 Веласпорт. Кубак Бельгіі.
19.30 Веласпорт. «Джыра-д'Італія»-2017.
20.30 Веласпорт. «Тур дэ Франс»-2016.
23.00 Ралі. ERC. All Access.

### Кінакамедыя

0.25 Камедыя «Вясёлыя і загарэлыя».***
2.10 Камедыя «Шлюб па-італьянску».0
3.45, 14.20, 15.10 «Камедыянты (Шоу)».***
4.50 Камедыя «Адзінокі па кантракце».***
6.40 Меладрама «Чаго хочуць жанчыны?»***
8.50 Камедыя «Праклён нефрытавага скарпіёна».***
10.40 Камедыя «Місія: неадэкватная».***
12.20 Камедыя «Міс Пецігру жыве сённяшнім днём».***
14.00, 14.50, 15.40 Скетчкам «Паміж намі».***
16.00 Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць на вяселлі».***
17.40 Камедыя «Навагодняя жонка».***
19.25 Камедыя «Вікі».***
21.10 Камедыя «10 дзён, каб закахацца».***
22.55 Камедыя «Вясельны разгром».****

### ТБ3

6.00 М/ф.
7.40 «Ёсць адзін сакрэт».***
8.05 «Доктар І...» ***
8.35, 18.50, 3.40 «Вузел лёсу». Серыял.***
10.20 «Судовыя страсці». Дак. серыял.***
12.00 «Сляпая».*
13.00 «Варажбітка».*
14.05 «Паралельны свет».*
15.05 «Трэндзі».***
15.35 «Здзелка».***
16.05 «Натуральны адбор».*
17.00 «Адкрыта».*
17.55 «Цікаўная Варвара». Серыял.*
20.55 «Магазіна».***
21.50 «Рэвізора».***
22.55, 5.30 «Лінія абароны».***
23.25 «Звышнатуральнае». Серыял.***
0.10 «Я, робат». Фантастыка.*
2.00 «Амерыканскі жаніх».***

### ТБ1000

6.10 Госця.*
8.50 Вялікая афёра.***
11.15 Трусіная нара.***
13.20 Акадэмія вампіраў.*
15.30 Шэф Адам Джонс.****
17.45 Іншапланецянін.
20.10 Чужая краіна.****
22.20 Прыгажосць па-англійску.****
0.25 Шукальнік вады.***
2.30 Выратаванне.***
4.00 Салодкі лістапад.*

### ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Бліндаж. Серыя 2-я.*
8.25 Ён — Дракон.
10.40 Маршрут пабудаваны.***
12.25 Дзень камандзіра дывізіі.
14.20, 2.40 Дзень выбараў-2.*
16.30 Будзь са мной.***
18.05 Бумер-2.****
20.20 Брэсцкая крэпасць.***
23.00 Дэманы.****
0.20 Адмірал.***
4.40 Кококо.****

### National Geographic

6.00, 13.25 Гульні розуму.*
6.45, 5.35 Навуковыя недарэчнасці.*
7.50, 10.15, 14.55 Мегазаводы.*
8.40, 11.00, 15.40 Міжнародны аэрапорт Дубай.*
9.25 Геній.***
11.45, 16.25, 19.30, 23.20, 2.25 Расследаванні авіякатастроф.*
12.30, 18.40, 21.45, 1.35, 4.45 Гісторыя Бога з Морганам Фрыменам.***
14.10 Чалавек супраць YouTube.*
20.15 Аўта-SOS.*
21.00, 0.50, 4.00 Інстынкт выжывання.***
22.35 Сваіх не кідаем.***

### Discovery

8.00, 14.00, 0.00, 3.50 Выжыць любой цаной.***
9.00, 15.30, 21.30, 5.55 Як гэта ўстроена?*
9.30, 15.00, 21.00, 5.30 Як гэта зроблена?*
10.00, 16.00, 23.00, 7.10 Паляўнічыя на рэліквіі.*
10.30, 16.30, 19.00, 23.30, 2.00, 7.35 Паляўнічыя на склады.***
11.00 Металаломшчыкі.*
17.00, 22.00, 6.20 Махінатары.*
18.00, 1.00 Бітва з акіянам.*
20.00 Космас навыварат.
2.55 Як працуюць машыны.*
4.40 Маланкавыя катастрофы.***

## Усходні гараскоп на



**АВЕН.** Напружаны працоўны тыдзень. З самага пачатку ў вас з'явіцца маса розных задач, і кожная з іх будзе тэрміновай і неадкладнай. Паклічце на дапамогу вашу незвычайную працаздольнасць, добрасумленнасць і пунктуальнасць і будзеце асуджаныя на поспех у справах і важных перамовах. У аўторак і сераду верагодныя нязначныя канфлікты з начальствам, але, калі вы не пакутуеце залішняй крыўдай, то, убачыўшы свае памылкі і выправіўшы іх, толькі выйграеце.



**ЦЯЛЕЦ.** Тыдзень калі і запатрабуе напружання, то мінімальнага. Важна проста не выпусціць свой шанц. У аўторак удала пройдуць дзелавыя сустрэчы, неабходная інфармацыя своечасова прыйдзе да вас. Чакаюцца пазітыўныя змены на прафесійнай ніве. Памятайце, што там, дзе няма прамога рашэння, як правіла, дапамагае дыпламатычнасць і гатоўнасць да кампрамісу. У пятніцу не дапускайце нават мінімальнай праявы агрэсіі. Толькі прыязнасць зможа вырашыць вашы праблемы.



**БЛІЗНЯТЫ.** На гэтым тыдні часам будзе здавацца, што нават немагчымае магчыма, удача відавочна на вашым боку. У панядзелак і сераду вы, хутчэй за ўсё, апынецеся ў патрэбны час у патрэбным месцы, і тое, што здавалася праблемай, вырашыцца без намаганняў. На працы пастаўцеся з увагай да сваіх абавязкаў, не выпускайце з-пад увагі дробязяў. У другой палове тыдня магчымыя сур'ёзныя расходы, прычым далёка не заўсёды абгрунтаваныя. У выхадныя дні адпачніце ад мітусні і не перашкаджайце блізкім людзям вас трохі папесціць.



**РАК.** Вам зараз неабходна засяродзіцца на адной, самай важнай справе, і тады вы з лёгкасцю здадзіце экзамен і пройдзеце любую праверку. Тыдзень будзе вельмі насычаны рознымі перамовамі, заключэннем дамоўленасцяў і набыццём саюзнікаў. Пачынаючы з чацвярга, лепш знізіць тэмп працы, каб пазбегнуцьператамлення. Паспрабуйце зразумець апанентаў, прыслухайцеся да іх думкі, можа быць, зменіцца ўспрыманне сітуацыі, якая стварылася. У выхадныя парадуюць сустрэчы з сябрамі.



**ЛЕЎ.** Падзеі тыдня будуць садзейнічаць поспеху ў асабістым жыцці, а вось у працы магчымыя праблемы, але не варта адчайвацца, гэта толькі часовая з'ява. Аўторак будзе дастаткова напружаным і насычаным падзеямі працоўным днём. Серада можа ўнесці нечаканыя карэктывы ў вашы планы, але гэта і да лепшага, аднак, у чым менавіта, вы зразумееце пазней. У пятніцу смела бярыцеся за самыя цяжкія справы, але не спяшайцеся з ацэнкамі і каментарыямі. Прыслухоўвайцеся да свайго сэрца ва ўсіх спрэчных сітуацыях, асабліва калі вам трэба будзе выбіраць сабе другую палавінку, што на гэтым тыдні больш чым верагодна.



**ДЗЕВА.** Ваша папулярнасць і аўтарытэт падвысяцца. Можа адбыцца нямала радасных падзей. Вы цяпер патрэбныя літаральна ўсім: і на працы, і дома. Нават тыя знаёмыя, пра якіх ужо амаль забыліся і якія таксама забыліся аб вашым існаванні, раптам з'явяцца побач, патэлефануюць або будуць чакаць паслугі. Гэта добры знак, не адмаўляйце ім ва ўвазе. Тыдзень схіляе да сямейных застолляў, а таксама розных іншых забаўляльных мерапрыемстваў.

## Субота, 24 чэрвеня

### Беларусь 1

**6.20** Існасць.
**6.45, 20.05, 21.40 Меладрама «Асколкі шчасця».***
**8.25** Кулінарная дыпламатыя.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Здароўе.
**10.00** Дача.
**10.35** Вялікі сэлфі-тур.
**11.10** 50 рэцэптаў першага.
**12.10, 15.45 Меладрама «Прыгавор ідэальнай пары».*****
**15.15** Краіна.
**16.40 Меладрама «Хатняя прыслужніца».***
**21.00** Панарама.
**0.10** Дзень спорту.
**0.20 Меладрама «Спяшайцеся кахаць».***

### Беларусь 2

**7.05** «Анлайн 2.0». Скетчкам.
**7.35, 22.05** Тэлебарометр.
**7.40 Фільм для дзяцей «Чырвоная Шапачка».***
**8.45** «Свет навыварат». Трэвел-шоу.
**9.40 Серыял «Шчаслівыя разам-5».*****
**10.45, 20.10** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу.
**12.35** Вяселле без баяна.
**13.10** «Моду народу».
**14.00** Анімацыйны фільм «Мадагаскар-3».*
**15.35** Капейка ў капейку.
**16.10** Два рублі.
**16.30** «Вяселле ўсляпую». Рэаліці-шоу.
**17.45 Трагікамедыя «Бедная багатая дзяўчынка».*****
**19.25** Рэпарцёр.
**22.00** Спортлата 6 з 49, КЕНО.
**22.10** «Вярніце мне прыгажосць». Медыцынскае рэаліці.

**23.25 Фантастыка «Трансформеры-3: цёмны бок Месяца».***

### Беларусь 3

**7.45** «Сіла веры».
**8.10, 12.00, 20.15** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.25, 12.15, 20.30, 22.35** «Гэты дзень».
**8.30** «Беларуская кухня». Пірог «Трухлявы пень».
**9.00, 17.05** «Час кіно».
**9.05 «Вячэра з прыдуркам». Камедыя.***
**10.30** «Я хачу гэта ўбачыць!» Гродна.
**10.55** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**11.25** «Навукаманія».
**11.50** М/ф.0
**12.20 «Саламяны капялюшык». Камедыя.***
**14.30** «Камертон». Кампазітар Уладзімір Кандрусевіч.
**14.55** «Эти глаза напротив...» Вечар песень Валерыя Абадзінскага.
**16.25** «Апошні дзень». Яўген Мацвееў.
**17.15 «Вершнікі». Маст. фільм.***
**19.20** «Майстры і куміры». Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Алег Мельнікаў.
**20.40** «Калыханка».
**21.05 «Вясёлая моладзь». Камедыя.***
**22.40** Сусветная класіка. Канцэрт Brian May & Kerry Ellis.

### Беларусь 5

**8.00** Бокс. Чэмпіянат Еўропы. 1/2 фіналу.
**10.45, 14.55, 20.00** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы. Суперліга.
**13.30** Тэніс. Турнір WTA.
**17.55** Футбол. Кубак канфедэрацый. Мексіка — Расія. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**21.20** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. 1/2 фіналу. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

**23.10** Спорт-цэнтр.
**23.20** Бокс. Чэмпіянат Еўропы. Фіналы.

### АНТ

**7.00, 8.05** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».0
**9.20** «Здароўе».***
**10.30** «Смак».*
**11.10** «Ідэальны рамонт».
**12.10** «Разумніцы і разумнікі».*
**13.20** Да юбілею актрысы. «Наталля Варлей. «Вяселля не будзе!»
**14.25 Маст. фільм «Вій».**
**16.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Ералаш».
**16.45** «Хто хоча стаць мільянерам?»
**17.45** «Кропля ў кроплю».***
**21.05** «Сёння вечарам».***
**22.35 Меладрама «Каханне са слоўнікам».***
**0.15 Маст. фільм «Маліса ў краіне цудаў».***

### СТБ

**6.10 «Салдаты і афіцэры». Серыял.**
**7.25** «Анфас».
**7.40** «Тайны Чапман».***
**8.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».***
**9.30** «Рамонт па-сумленнаму».
**10.10** «Самая карысная праграма».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35** Фестываль самадзейнасці «Белдзяржхарчпрама» ў Бабруйску.
**13.15** «Усім па катку».***
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40** «Адкрытая размова».
**13.55, 1.00 Камедыя «Тры плюс два».***

**15.45** «Далёкія сваякі».
**15.55** «Вялікі горад».
**16.40** «Вадзіць па-руску».***
**17.10 Камедыя «Кін-дза-дза!»***
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Засакрэчаныя спісы. Знакі катастроф. Папярэджанне звыш».***
**21.50 «Белыя ваўкі». Серыял.**

### МІР

**6.00, 8.20** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**6.25 Маст. фільм «Тайна жалезных дзвярэй».***
**7.50** «Саюзнікі».*
**9.00** «Вой, мамачкі!»*
**9.30, 15.00** «Любімыя акцёры».*
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Зроблена ў СССР».*
**10.45 Серыял «Міраж».***
**15.30** «Цяжар абеду».*
**16.15 Серыял «Крутыя берагі».*****
**23.20 Серыял «Мафіёза».*****
**2.15 Маст. фільм «Адзін дзень».*****
**3.55** М/ф.0

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.40 Серыял «Сямейны дэтэктыў».***
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.20** «Жывыя гісторыі».
**12.15** «Пяцёра на аднаго».
**13.05** «Наша справа».
**13.20, 14.15 Маст. фільм «Князёўна з хрушчоўкі».***
**17.10** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.55** «Гумар! Гумар! Гумар!!!»***
**22.40 Маст. фільм «Каханне гаворыць».***

### НТБ—Беларусь

**6.20** «Астрапрагноз».
**6.25** «Зоркі сышліся».***
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «Урачэбныя тайны плюс».
**8.55** «Прыгажосць па-руску».
**9.45** «НЗ.by».
**10.20** Галоўная дарога.
**11.05** «Ежа жывая і мёртвая».
**12.05** Кватэрнае пытанне.
**13.15** «Паездзем, паядзім!»
**14.05 Баявік «Непераможны».*****
**16.20** «Следства вялі...»
**17.10** «Сакрэт на мільён». Юля Волкава.***
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.00** «Ты супер!» Да і пасля...
**22.15 Маст. фільм «Можна, я буду зваць цябе мамай?»***
**23.50** НТБ-бачанне. «Стары, пых-пых і мора».*

### 8 канал

**9.00, 15.55, 18.50, 21.15, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** «Сябры дзядулі Марка».
**9.30** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**9.45 «Сінематограф». Маст. фільм «Генералы пяшчаных кар'ераў».**
**11.20 Драма «Што хавае хлусня».**
**13.05 Камедыя «Хто падставіў труса Роджэра».**
**14.45** Глядзім усёй сям'ёй. М/ф «Прыгоды братца Труса».
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30** «Вяселле па разліку».
**17.00** «Мультпарад».
**17.20 Камедыя «Вяселле па абмене».**
**18.55 Меладрама «Шукальнікі прыгод».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.00** «Фэшн is my прафэшн».
**21.20 Дэтэктыў «Дзесяць негрыцянят».**

### ВТБ

**6.00, 15.00, 1.40** «Турбамісер».***
**6.30** Скетч-шоу «6 кадраў».***
**7.30** Серыял «Супер Макс».***
**8.30** М/ф «Егіптус».0
**9.00, 3.00** М/ф «Ёка».0
**9.25, 3.25** М/ф «Смяшарыкі».0
**9.40, 3.40** М/ф «Фіксікі».0
**10.00, 2.30** «Ералаш».0
**11.20** Анімацыйны фільм «Праўдзівая гісторыя Чырвонай Шапкі».*
**13.00** Серыял «Вы ўсе мяне прыводзіце ў шаленства».***
**16.20** Фантастыка «Захавальнікі».***
**19.30, 21.30** «Уральскія пельмені».***
**21.00** Фэнтэзі «Іншы свет».***



**23.20** Фантастыка «Суддзя Дрэд».***
**1.10** «Сэрцы за каханне».***
**4.00** «Лаві момант».***
**5.00** «Дурні і дарогі».***

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Кутузаў». Маст. фільм.
**11.55** «На гэтым тыдні... 100 гадоў таму. Нефрантавыя нататкі».
**12.25, 1.00** «Жывая прырода Індакітая». Дак. серыял.
**13.20** «Дарогамі вялікіх кніг». Дак. фільм.
**13.45** «Гарык». Дак. фільм.
**14.40** Да 80-годдзя з дня нараджэння Альберта Філозава. «Ціхоня». Маст. фільм.
**15.50** «Лінія жыцця». Альберт Філозаў.
**16.45, 2.40** Сусветныя скарбы.
**17.00** Навіны культуры.
**17.30** «Астравы». Яўген Лявонаў.
**18.15** «Пра беднага гусара закіньце слова». Маст. фільм.
**21.00** «Агора». Ток-шоу.
**22.00** Кіно на ўсе часы. «Піраты з Пензанса». Маст. фільм.
